ЗЯЛЁНАЯ ЭКАНОМІКА — БЕЛАРУСІ —

# Клімытычная палітыка Беларусі

Глабальныя змены клімату шмат у чым вызначаюць вектар развіцця сучаснай эканомікі і грамадства. Незалежная Міжнародная група экспертаў па пытаннях змены клімату са 195 краін (МГЭЗК/IPCC) **пацвердзіла сувязь змен клімату з дзейнасцю чалавека**. Асноўная прычына кліматычных змяненняў – выкіды парніковых газаў (ПГ): дыяксіду вугляроду (CO2), метану (NH4), аксіду азоту (N2O) і інш. Большая частка выкідаў выклікана выкарыстаннем выкапнёвага паліва – нафты, газу і вугалю – у энергетыцы, транспарце і прамысловасці.

*- Выкіды ў Беларусі ў 2021 годзе склалі 92,0 млн. т. CO2-эквіваленту ў год.*

*- Найбольшая доля прыпадае на энергетыку і транспарт – 58.5%. Істотны ўклад уносяць сельская гаспадарка (21,1%), прамысловасць (6%), утылізацыя адходаў (6%), будаўніцтва і эксплуатацыя будынкаў.*

Кліматычныя змены узмацняюцца зніжэннем эфектыўнасці натуральных механізмаў паглынання парніковых газаў з атмасферы ў выніку скарачэння плошчы лясоў, балот і наземных экасістэм, зменаў у структуры землекарыстання.

Змяненне клімату прыводзіць да катастрафічных наступстваў – засух, хваль спякоты, паводкаў, рэзкіх ваганняў надвор'я, ураганаў і іншых прыродных з'яваў. У Еўрапейскім рэгіёне, у тым ліку Беларусі, змены клімату адбываюцца больш высокімі тэмпамі ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі свету. У 2022 годзе ў ЕС каля 15 000 смерцяў звязваюць з хвалямі спякоты, а агульная шкода ад неспрыяльных з'яваў надвор'я склала больш за 2 млрд. $.

## *Чаму Беларусі неабходна нацыянальная кліматычная палітыка?*

1. Беларусь сутыкаецца са **шкодай** ад засух, вятроў, расце ўздзеянне хваляў спякоты на ўразлівыя групы – пажылых людзей, дзяцей. У наступныя дзесяцігоддзі гэтыя фактары будуць мець усё большы уплыў за кошт змен у кліматычнай сістэме, якія ўжо адбываюцца.
2. Беларусь узяла на сябе **міжнародныя абавязацельствы**, падпісаўшы ў 2016 г. Парыжскае пагадненне (ПП), мэта якога - абмежавання росту тэмпературы не больш за +1.50°C / +2°C да канца стагоддзя. Узятыя Беларуссю абавязацельствы скараціць да 2030 года выкіды парніковых газаў на 35% ад узроўню 1990 г. азначае фактычнае павелічэнне выкідаў, а нацыянальныя Стратэгія дасягнення вугляроднай нейтральнасці і Стратэгія адаптацыі да змен клімату не былі распрацаваныя.
3. Кліматычныя палітыкі іншых краін істотна **паўплываюць на вугляродаёмкую эканоміку Беларусі** праз увядзенне "вугляродных збораў", новых стандартаў экалагічнасці і цыркулярнасці прадукцыі, абавязковай ESG-справаздачнасці кампаній для выхаду на біржы і атрымання інвестыцый. Знізіцца попыт на нафтапрадукты, угнаенні, прадукцыю МТЗ, БелАЗ, МАЗ, БМЗ, іншых беларускіх прадпрыемстваў і сельскай гаспадаркі.

З'яўляючыся неад'емнай часткай Еўропы і імкнучыся стаць развітай Еўрапейскай дзяржавай, Беларусь ставіць за мэту **сфармаваць мадэль зялёнага росту і пераходу да нізкавугляроднага развіцця**, падрыхтаваўшы новыя зялёныя драйверы эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу **па аналогіі з прынцыпамі і падыходамі Еўрапейскага зялёнага курсу** (European Green Deal).

Неабходна стварыць прызнаную на міжнародным узроўні нацыянальную сістэму вугляроднага рэгулявання, якая ўключае вугляродны рынак і вугляродны падатак, забяспечыўшы яе празрыстасць і ўстойлівасць, у тым ліку даючы гарантыі інвестарам, што рашэнні будуць накіраваныя на паслядоўнае нізкавугляроднае развіццё краіны.

## *Карысць для беларусаў*

Нацыянальная сістэма вугляроднага рэгулявання дазволіць пазбегнуць экспартных збораў на сотні мільёнаў долараў і перанакіруе іх на развіццё зялёнай эканомікі нашай краіны. Будуць стварацца новыя працоўныя месцы ў навуцы і адукацыі, кіраванні, фінансах, сувязях з грамадскасцю, развівацца зялёная вытворчасць і паслугі. Кліматычная палітыка дапаможа мінімізаваць шкоду ад змены клімату і адаптавацца да яго, а ў выніку – дапамагчы захаваць нашую планету прыдатнай для жыцця людзей.

## Якой павінна быць кліматычная палітыка Беларусі?

У сусветнай практыцы кліматычная палітыка ўключае як зніжэнне выкідаў парніковых газаў і павышэнне іх натуральнага паглынання, так і адаптацыю да змен клімату на ўсіх узроўнях.

Пытанні клімату павінны ўлічвацца ва ўсіх палітыках і планах развіцця эканомікі як новыя ўмовы развіцця. Для дасягнення вугляроднай нейтральнасці неабходныя намаганні ўсіх сфер эканомікі, дзяржаўнага кіравання, грамадства, бізнесу, навуковай супольнасці.

| Мэта | Практычная рэалізацыя |
|---|---|
| **1. Амбіцыйная кліматычная палітыка** | |
| - Распрацаванне **нацыянальнай стратэгіі**<br>- Стварэнне **плана адаптацыі** да змен клімату<br>- **Гарманізацыя** нацыянальнага заканадаўства з мэтамі ЕЗК<br>- **Развіццё патэнцыялу** кіравання, адукацыі і інфармавання | - Распрацаваць і прыняць стратэгію дасягнення вугляроднай нейтральнасці да 2050г.<br>- Стварыць дзяржаўныя інстытуты для распрацавання і рэалізацыі кліматычнай палітыкі<br>- Распрацаваць планы развіцця зялёнай эканомікі паводле галін<br>- Арганізаваць навучанне і стажыроўкі для навукоўцаў, чыноўнікаў, бізнесу, палітыкаў, падтрымліваць даследаванні<br>- Праводзіць інфармацыйныя кампаніі аб зменах клімату і ўкараніць праграмы навучання на ўсіх узроўнях<br>- Супрацоўнічаць з грамадзянскай супольнасцю і грамадскасцю ў сферы распрацавання і рэалізацыі кліматычнай палітыкі |
| **2. Нацыянальная сістэма вугляроднага рэгулявання** | |
| - Стварэнне **нацыянальнай сістэмы** вугляроднага рэгулявання<br>- Гарманізацыя нацыянальнай сістэмы з мэтамі і інструментамі Зялёнага курса | - Распрацаваць і прыняць прызнаную на міжнародным узроўні сістэму вугляроднага рэгулявання, якая ўключае вугляродны рынак і вугляродны падатак<br>- Распрацаваць методыкі ацэнкі бягучага ўзроўню вугляродаёмістасці тавараў, якія экспартуюцца<br>- Распрацаваць метадалогію і нарматыўна-прававую базу для ўкаранення маніторынгу, справаздачнасці і верыфікацыі выкідаў |
| **3. Падтрымка зялёнай эканомікі** | |
| - **Лібералізацыя эканомікі** і стварэнне рынкавых механізмаў<br>- Распрацоўка **галіновых стратэгій** па зялёнай эканоміцы<br>- Стварэнне спрыяльнага **інвестыцыйнага клімату** для зялёных галін<br>- Інтэграцыя эканомікі ў **глабальныя рынкі** | - Зняць абмежаванні на развіццё галін зялёнай эканомікі<br>- Распрацаваць Інвестыцыйны план зялёнай эканомікі<br>- Укараніць фінансавыя механізмы: зялёныя інвестыцыі, субсідыі, зялёны фонд<br>- Укараніць зялёную таксанамію (класіфікацыя дзейнасці)<br>- «Азеляніць» эканоміку, укараняючы новыя стандарты і інавацыі<br>- Забяспечыць рэалізацыю міжнародных прынцыпаў SEA і EIA для ацэнкі праектаў і планаў<br>- Падтрымліваць развіццё ў Беларусі ўласнай вытворчасці<br>- Развіваць зялёную энергетыку, перапрацаванне адходаў, зялёны транспарт, арганічнае земляробства, экатурызм |

### *Крыніцы фінансавання рэформы*

Пытанне кошту распрацавання і ўкаранення кліматычнай палітыкі неабходна суадносіць са стратамі эканомікі, калі ўсё пакінуць як ёсць. Неабходна правесці эканамічную ацэнку змянення клімату на галіне гаспадаркі Беларусі, ацаніць затраты і выгады на мерапрыемствы па скарачэнні выкідаў і адаптацыі. Адной з крыніц інвестыцый у праграмы кліматычных дзеянняў могуць стаць ЕС і міжнародныя фінансавыя інстытуты.

*- Паводле ацэнак UNCTAD, калі ў Беларусі не будзе створана нацыянальная сістэма гандлю квотамі на выкіды, пры кошце вугляроднага падатку 88$ з 2026г. прагназуецца падзенне экспарту на 6,8% са зніжэннем даходаў на 200 млн.$ у год.*

*- Па дадзеных Сусветнага Банка, шкода ад анамальных з'яў надвор'я ў 2010-х гг. складаў каля 100 млн.$ у год, а страты з-за забруджванні паветра больш за 5% ВУП.*

*Аўтары: Аляксандра Мамаева ў супрацы з беларускім экспертам*
*Падрыхтавана CASE у супрацы з Эканамічнай камандай*
*Офіса Святланы Ціханоўскай пры фінансавай падтрымцы MATRA*